За сродкі мясцовых уладаў у асобнай невялікай вежы была абсталявана абсерваторыя. Адмысловы жалезны купал, які паварочваўся пры дапамозе адпаведных механізмаў, быў выраблены ў Варшаве. Фірма-вытворца «Гостынскій & К°» займалася яго мантажом на будынку вучыльні. Праўда, тэлескопу на момант адкрыцця вучэбнай установы там не было.

Другая частка будынку – трохпавярховая камяніца – прызначалася пад кватэры педперсаналу. Толькі пад апартаменты дырэктара тут было адведзена шэсць пакояў.

Першапачатковая смета ўсіх работ з матэрыяламі склала 176 тыс. руб. Пры гэтым прыкладна $^{1}/_{3}$ гэтай сумы асігнаваў горад. Таксама ён выдзяляў пляц пад будынак (коштам каля 40 тыс. руб.). Канчатковыя расходы склалі каля 200 тыс. руб. Асноўныя сродкі на яго пабудову паходзілі з сум Міністэрства народнай асветы.

Новы будынак выкарыстоўваўся рэальным вучылішчам толькі адзін навучальны год. Ужо ўлетку 1914 г. ён быў рэквізаваны пад патрэбы вайсковага шпіталя. У лютым 1915 г. вучылішча было вымушана эвакуавацца: спачатку ў Слонім, а пасля ў Калугу, дзе яно яшчэ некаторы час працягвала сваю дзейнасць.

**ЛІТАРАТУРА**

1. НГАБ у Гродне. Ф. 41, воп. 1, спр. 6.
2. НГАБ у Гродне. Ф. 41, воп. 1, спр. 18.
3. НГАБ у Гродне. Ф. 41, воп. 1, спр. 19.
4. НГАБ у Гродне. Ф. 41, воп. 1, спр. 28.
5. Наше утро 1913 год. № 176, № 191, № 194, № 201, № 248.
6. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад фартоў да Каложы. – Гродна, 2012. – С. 262-263.

УДК 947.6

# ДЫВЕРСІЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ГЕРМАНСКІХ СПЕЦСЛУЖБАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў 1943-1944 ГГ.

**Рыбак Н. А.**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Нямецка-фашысцкія захопнікі напрацягу ўсёй Вялікай Айчыннай вайны рыхтавалі дыверсантаў і тэрарыстаў для закідвання іх у савецкі тыл. Такая праца актывізавалася на заключным этапе вайны.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

На тэрыторыі Беларусі нямецка-фашысцкімі акупантамі былі створаны спецыяльныя школы для падрыхтоўкі шпіёнаў, дыверсантаў, разведчыкаў. У першыя месяцы вайны органы дзяржбяспекі БССР не мелі дакладнай інфармацыі пра месца знаходжання і сістэму навучання ў спецшколах абвера, СД і гестапа. Толькі ў 1943 г. былі сабраны звесткі пра спецшколы ў Барысаве, Бабруйску, Магілёве, Навагрудку, Гомелі. Навучанне ў школах абвера працягвалася 3 месяцы, пасля чаго выпускнікі школ выкарыстоўваліся для разведвальнай і дыверсійнай работы ў тыле Чырвонай Арміі, непасрэдна ў Віцебскай, Магілёўскай і Гомельскай абласцях.

Па меры вызвалення тэтыторыі БССР ад нямецкіх захопнікаў цікавасць апошніх да савецкіх стратэгічных аб’ектаў працягвала узрастаць. Сілавыя структуры БССР спрабавалі адсочваць і ліквідаваць дыверсантаў супраціўніка.

Пасля вызвалення БССР ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў закідка германскай агентуры і дыверсантаў працягвалася. Прычым з гэтай мэтай выкарыстоўваліся спецыяльна падрыхтаваныя непаўналетнія. Усе яны – падлеткі ва ўзросце 12-15 гадоў – былі сабраны фашыстамі з дзіцячых дамоў Смаленскай і Мінскай абласцей ў перыяд акупацыі. Напрацягу года яны навучаліся выбуховай, парашутнай і дыверсійнай справе [1, ф. 46, воп. 1, спр. 2, а. 34]. Усяго немцамі ў гэты перыяд было закінута звыш 48 падлеткаў-дыверсантаў.

Разам з тым, для актывізацыі антысавецкай барацьбы ў тыле Чырвонай Арміі нямецкія разведвальныя органы закідвалі сваю агентуру на тэрыторыю заходніх абласцей БССР з мэтай *«…устанавления связи с действующим здесь националистическим подпольем…»* [1, ф. 38, воп. 1, спр. 57, а. 88]. На глебе антысаветызму германская разведка імкнулася выкарыстаць у сваіх мэтах дзеячоў польскага і беларускага нацыянальнага руху.

Для актывізацыі падрыхтоўкі дыверсантаў і шпіёнаў у мястэчку Дальвіц (Усходняя Прусія) у ліпені-жніўні 1944 г. функцыянавала разведвальна-дыверсійная школа. *«Дальвіцкі батальён»* налічваў каля 200 чалавек. Усе яны былі добра падрыхтаваны да ажыцяўлення разведвальна-дыверсійнай работы ў тыле Чырвонай Арміі. Першая група яе выпуснікоў у колькасці 4 чалавек была закінута ноччу з 15 на 16 верасня 1944 г. у Дзятлаўскі раён Баранавіцкай вобласці [2]. Спробы закінуць на тэрыторыю Заходняй Беларусі *«дальвіцкіх»* дыверсантаў прадпрымаліся і ў далейшым, аднак усе нямецкія дыверсійна-тэрарыстычныя групы былі ліквідаваны сілавымі структурамі БССР.

Такім чынам, германская разведка на тэрыторыі Беларусі імкнулася арганізаваць і праводзіць актыўную дыверсійна-



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

тэрарыстычную дзейнасць. З гэтай мэтаю ёю былі створаны шматлікія спецшколы, якія рыхтавалі разведчыкаў, шпіёнаў і дыверсантаў для закідкі ў савецкі тыл, а таксама ў партызанскія атрады. Нямецка-фашысцкія спецслужбы выкарыстоўвалі для выканання сваіх заданняў розных людзей: ваеннапалонных, здраднікаў радзімы, крымінальны элемент і некаторых прадстаўнікоў калабарацыі. Усе яны прайшлі навучанне ў спецшколах абвэра, СД і гестапа. Аналіз большасці заданняў, якія атрымоўвалі германскія агенты паказаў, што нямецкая разведка сабірала дадзеныя пра стан абароны савецкіх войск, намеры камандавання Чырвонай Арміі, а таксама пра рух войскаў, тэхнікі і грузаў.

Напярэдадні правядзення аперацыі *«Баграціен»* разведвальна-дыверсійная работа германскіх спецслужбаў яшчэ больш актывізавалася. Пасля вызвалення тэрыторыі рэспублікі ад фашысцкіх захопнікаў працягвалася закідка нямецкай агентуры ў Беларусь. Германскія спецслужбы выкарыстоўвалі нават дзяцей-падлеткаў, якія былі спецыяльна падрыхтаваны для вядзення тэрарыстычнай і разведвальнай дзейнасці. Спецслужбы фашысцкай Германіі правялі шмат аперацыяў па ўкараненню сваёй агентуры, аднак яны сутыкнуліся з супрацьдзеяннем ворганаў контрразведкі *«Смерш»*, якія выкрылі і ліквідавалі большасць агентаў.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Архіў УУС Гродзенскага аблвыканкама.
2. NKWD o polskim podziemiu 1944-1948. Konspiracja polska na Nowogródczyźnie i Grodzieńszczyźnie. – Warszawa, 1997. – 404 s.

УДК 347.1

# ПРИЗНАКИ ПРАВА ОПЕРАТИВНОГО УПРАВЛЕНИЯ КАК ОГРАНИЧЕННОГО ВЕЩНОГО ПРАВА

**Рылко Е. И.**
УО «Белорусская государственная сельскохозяйственная академия»
г. Горки, Республика Беларусь

В гражданском законодательстве право оперативного управления отнесено к категории ограниченных вещных прав, тем не менее в научной среде вопрос о юридической природе рассматриваемого института является дискуссионным.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ